Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
10 ВЕРАСНЯ 2016 г. СУБОТА № 175 (28285)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Жыць весела і ў 65**
СТАР. 5



**Голас «спявачкі свету» гучаў у Мінску**
СТАР. 9



**Амаль забыты герой Перамогі**
СТАР. 10–11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі:**

*«Жаданне ісці ў парламент на шкоду ўласнай справе можа быць цалкам бескарыслівым крокам. Чалавек можа гаварыць, што ён усё зарабіў, у яго ўсё ёсць, капітал працуе сам па сабе, а ён хоча служыць грамадству. Але, у прынцыпе, бізнес і палітыку, бізнес і ўладу лепш не змешваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9477 | ▲ |
| Еўра | 2,1953 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0729 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Ваш голас важны для краіны

**Сёння апошні дзень датэрміновага галасавання, заўтра — непасрэдны дзень выбараў. У гэтым годзе атрымаць бюлетэні для галасавання могуць 6 990 696 грамадзян нашай дзяржавы**

**У нас удзел у выбарах з'яўляецца свабодным. Тым не менш, па словах старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ, для кожнага грамадзяніна важна прыйсці на выбары.**

**ВАЖНА!**
11 верасня ў дзень выбараў чытачы «Звязды», наведвальнікі інтэрнэт-партала Выдавецкага дома «Звязда» змогуць у рэжыме рэальнага часу адсочваць ход галасавання па ўсёй краіне. Нашы карэспандэнты будуць весці анлайн-трансляцыю з інфармацыйнага цэнтра «Выбары-2016». Далучайцеся!

У відэазвароце, размешчаным на рэсурсе vybory2016.by, старшыня Цэнтрвыбаркама адзначыла, што для таго каб выбары ў Палату прадстаўнікоў адбыліся, у іх павінны прыняць удзел больш за 50% грамадзян, унесеных у спісы для галасавання. «Таму настолькі важная яўка выбаршчыкаў», — патлумачыла яна.

Старшыня ЦВК заклікала ўспрымаць гэта з разуменнем, бо выбары — важнае дзяржаўнае мерапрыемства. «І нават справа не ў тым, што яны каштуюць досыць дорага (каля $ 10 млн), але ў тым, што выбары парламента, паспяховае завяршэнне найважнейшай палітычнай кампаніі — гэта перш за ўсё аснова палітычнай стабільнасці нашай дзяржавы. Гэта паўнавартасны палітычны легітымны орган, які будзе супрацоўнічаць з парламентамі іншых дзяржаў, годна прадстаўляць нас і абараняць нашы інтарэсы», — падкрэсліла старшыня ЦВК. «Калі не задавальняюць кандыдаты, якія балатуюцца па вашай выбарчай акрузе, існуе графа «Супраць усіх». Хоць, думаю, што ў нас добры падбор кандыдатаў, якія прадстаўляюць усе пункты гледжання», — заўважыла Лідзія Ярмошына.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**




Гэтыя гамяльчанкі, якіх наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук сустрэў учора на Кастрычніцкай плошчы, прыехалі ў сталіцу на двухдзённую канферэнцыю. Яны запэўнілі, што ў нядзелю, вярнуўшыся ў родны горад, абавязкова пойдуць на выбары.

■ Ведай нашых!

## ЧЭМПІЁН З ХАРАКТАРАМ КАМІКАДЗЭ

### Беларусь узяла першае «золата» на Параалімпіядзе ў Рыа



**У Беларусі з'явіўся свой Майкл Фэлпс — Ігар Бокій пяць разоў перамагаў на Параалімпійскіх гульнях у Лондане, а цяпер заваяваў «золата» і ў Рыа. Медаль стаў першым для нашай зборнай на спартыўным форуме, які праходзіць у Бразіліі.**

Пераможным для беларуса стаў заплыў на 100 метраў батэрфляем у катэгорыі S13 (спартсмены з парушэннямі зроку). Ігар Бокій паказаў вынік у 53,85 секунды і пабіў сусветны рэкорд, які належаў яму самому. Найбліжэйшымі пераследнікамі сталі ўзбекі Кірыл Панкоў і Музафар Турсунхаджаеў.

«У нас не было ніякіх чаканняў ад заплыву, — цытуе беларускага чэмпіёна афіцыйны сайт Гульняў. — Мы проста зацята працавалі разам з трэнерам, і менавіта тут я змог выкласціся па максімуме, каб дасягнуць найлепшага магчымага выніку. Цяпер я нерваваўся значна больш, чым чатыры гады таму ў Лондане. На мне ляжаў цяжкі груз адказнасці, бо вельмі шмат людзей верылі ў мяне і спадзяваліся на поспех, я не хацеў іх расчараваць. Гэта падштурхоўвала мяне працаваць і працягваць паказваць добрыя вынікі. Мой трэнер заўсёды паўтарае адну фразу ўсім падапечным: «Каб перамагчы, ты павінен мець характар камікадзэ. Ты павінен ісці да канца і не звяртаць увагі на тое, што адбываецца вакол і ўнутры цябе».

**Са знакавай перамогай Ігара Бокія павіншаваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, пра гэта паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!